View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



Заяц Наталля Віктараўна, г.Мінск

# ВАЕННАЕ МІНУЛАЕ Ў МАСТАЦКІМ БАЧАННІ ВАСІЛЯ ЗУЁНКА

Васіль Зуёнак з плеяды тых мастакоў слова, чыё дзяцінства было абпалена вайной. Ваенная тэма арганічна ўвайшла ў паэзію яго пакалення, перадусім, праз успаміны аб нялёгкім маленстве. Як заўважае В.Зуёнак, менавіта яно дало пісьменнікам-шасцідзесятнікам творчую глебу і грунт на ўсё жыццё [1: 84]. Паказальна, што ў творах равеснікаў – паэтаў і празаікаў – Р.Барадуліна, Н.Гілевіча, Г.Бураўкіна, М.Арочкі, Я.Сіпакова, І.Чыгрынава, В.Адамчыка, І.Пташнікава і многіх іншых вайна малюецца вачыма дзяцей, перадаецца праз прызму непасрэднага дзіцячага ўспрымання. Характэрнай адзнакай іх твораў, у тым ліку і эпічных, з’яўляецца лірызм – узрушанасць, усхваляванасць як вынік асабістай далучанасці да падзей. Нямала вершаў В.Зуёнка таксама навеяны памяццю маленства, аднак у асэнсаванні паэтам гэтай тэмы ёсць свае нюансы. У мастацкім бачанні В.Зуёнка вайна – не толькі ўспамін пра ваеннае мінулае; паэт падкрэслівае, што для многіх мір так і не настаў. Пачынаючы ўжо з першай паэтычнай кнігі “Крэсіва” (1966), В.Зуёнак звяртаецца да *праблемы няскончанай вайны*, прычым у многіх вершах яна раскрываецца ў эпічным ключы, праз вобразы герояў твораў.

Вайна працягваецца для бязногага ветэрана, які і праз шмат гадоў ніяк не можа прывыкнуць да “нагі са скрыпам хромавым”. Не скончылася яна для маці, удоў і нявест, што доўгія дні і ночы чакаюць салдат дадому. Адным з першых у беларускай літаратуры “ўбачыў” мацярынскае гора П.Глебка (верш “Агні”, 1955), пазней пра несціханы боль жанчын пісалі П.Панчанка, К.Кірэенка, А Вярцінскі і інш., па-свойму пра народжаную вайной праблему сказаў і В.Зуёнак. Лірычны вобраз-перажыванне ў такіх творах паэта “аб’ектывізуецца”, галоўная ўвага канцэнтруецца не на ўласным унутраным свеце, а на раскрыцці жыццёвай драмы героя-“персанажа”, як у эпасе. За вонкавай адасобленасцю аўтара востра адчуваецца яго суперажыванне, за стрыманасцю апавядання – эмацыйная напружанасць. Напрыклад, у вершы “З вайны сустрэлі мацеркі сыноў...” (зб. “Крэсіва”, 1966) В.Зуёнак знешне спакойна і стрымана расказвае пра трагедыю маці, пра яе балюча-шчымлівую, нязгаслую надзею ўбачыць сына – паэт, такім чынам, выступае ў якасці апавядальніка.

Яшчэ адна грань праблемы няскончанай вайны – заўчаснае ўдоўства, трагедыя вечных салдацкіх нявест – таксама асэнсоўваецца на прыкладзе “персанажаў”, пры актыўным уплыве эпічных фактараў. Так,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

у вершы “Дзень і ноч...” (зб. “Крутаяр”, 1969) праз асобныя штрыхі-дэталі ствараецца панарама жыцця салдаткі ад часоў вайны, калі яна атрымала “прыгавор неабвержны”, да яе апошніх хвілін – сюжэт набывае эпічную разгорнутасць. У полі зроку паэта не толькі цяжкі лёс і “бяссоннае гора” маладой удавы, ён спрабуе зазірнуць у душу жанчыны, якая стварыла другую сям’ю, аднак не знайшла спакою – аўтар, такім чынам, робіць акцэнт на маральным аспекце праблемы. Вобразу героя-персанажа аддаецца ўвага паэта і ў баладным па гучанні вершы “Вера” са зборніка “Лета трывожных дажджоў” (1990), у якім паўстае жыццё вясковай жанчыны, жорстка падзеленае на дзве палавіны (“Дзеўкай адспявала – / Бабаю адплакала...”). Да старасці чакала яна свайго жаніха, захоўвала вернасць каханаму, аднак яе вера і вернасць не змаглі ўваскрасіць салдата.

Калі ў творах “Дзень і ноч...”, “Вера” праблема трагічна адкарэктаванага вайной жаночага лёсу раскрываецца ў маральна-пачуццёвым аспекце, то ў вершы “Пасылка” (зб. “Чорная лесвіца”, 1992) да гэтага падключаецца яшчэ і сацыяльны. Як дзяржава ставіцца да тых, чые мужчыны аддалі жыццё дзеля вызвалення Радзімы? Улада нібыта не забылася на ўдаву: ветэранцы і медаль далі, і адрэз на сукенку. Але тая ж улада нічога не зрабіла, каб палепшыць жыццё вясковай жанчыны. Фармальнасць ушанавання ўдавы падкрэсліваецца сродкамі іроніі: “А потым былі ільготы – / З чырвонае гумы боты, / Каб лепей свінням насіць, / І гной – па калена – мясіць” [2: 94]. Напрыканцы адзінокай і нялёгкай жыццёвай дарогі жанчыну чакаў яшчэ адзін “падарунак”, які развярэдзіў даўнія раны, прынёс у хату дыханне вайны, нагадаў пра страшнае казённае пісьмо – пахавальную. Лірычны верш набывае моцную эпічную падсветку: праявы сучаснага жыцця яскрава адбіваюцца ў творы, напаўняючы новым зместам пасляваенную праблему. Падарункі “пераможцам” ад “пераможаных” сталі распаўсюджанымі ў паслячарнобыльскія часы, але чым яны на самой справе з’яўляюцца: падтрымкай у бядзе ці прыніжэннем, здзекам з пачуццяў “маленькага” чалавека? В.Зуёнак не вітае падобную дапамогу: у творы ўдава адмаўляецца ад чарговай – ужо нямецкай – “узнагароды”, не дазваляе сабе зняважыць памяць пра забітага мужа.

З часам тэма няскончанай вайны ў творчасці В.Зуёнка яшчэ больш драматызуецца, узбуйняецца і “эпізуецца”, пра што сведчыць, напрыклад, верш 2001 года “Удовы (Сюжэт для сучаснага рамана)”. Сапраўды, сюжэт твора патрабуе хутчэй раманнага ўвасаблення – настолькі ён сэнсава аб’ёмны, шматпланавы, складаны. Гэты невялікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

верш канцэнтруе ў сабе “эпапейны” змест: розныя іпастасі праблемы “жанчына і вайна” паказаны на лёсе аднаго чалавека, аднаго пакалення. Вершам “Удовы” В.Зуёнак нібы адказвае на пытанне, якім у свой час задаваўся Я.Сіпакоў: “Няўжо ў адну вайну ад салдата радзіўся хлапчук, / Каб у другую памерці салдатам?” [3: 165]. Дзве вайны – Вялікая Айчынная і вайна ў Афганістане – нанеслі беларускай сялянцы Мані незагойныя раны, забраўшы мужа і сына. Аднак трагедыя, як бумеранг, зноў вяртаецца – у гарах Каўказа забіты яе ўнук. В.Зуёнак, такім чынам, закранае зусім новую для беларускай паэзіі праблему сучаснай каўказскай вайны. Баба Маня адзінокая ў сваім горы, толькі ціха плачуць разам з ёй сяброўкі “...аб сваім, няйначай, лёсе. / Бо сыноў яны не мелі, / Без замужжа аўдавелі. / Іх каханне – не сыны – / Не вярнуліся з вайны” [4: 8].

Паэт зводзіць разам народжаныя рознымі войнамі праблемы, кожная з якіх складаная і глыбокая сама па сабе: драма салдацкіх удоў і вечных нявест, “асірацелых” (у мірны для Беларусі час) маці і бабуль. Увогуле верш сведчыць пра эпічнае светабачанне паэта, яго здольнасць лірычнымі сродкамі перадаць шырокі раманны змест.

Мастацкае ўяўленне В.Зуёнка дапускае магчымасць таго, што сучаснікі могуць стаць “апошнім каленам людскога племені”. Лірычны герой многіх твораў – абагульнены вобраз Чалавека, заклапочанага будучыняй Зямлі, – імкнецца разварушыць “цяжкую памяць” ІІ-й сусветнай вайны, не дапусціць забыцця нядаўніх трагедый і прадухіліць новыя. Як некалі старажытны Катул, В.Зуёнак звяртаецца да вобраза каменя – маўклівага сведкі чалавечай гісторыі. “Паэтызацыя звычайнага шэрага каменя, – заўважыў А.Вярцінскі, – <...> вымагае шукаць, бачыць незвычайнае ў звычайным, узводзіць звычайнае ў ранг прыгожага” [5: 220]. Праз цудадзейны вобраз “чуйнага каменя”, “каменя-мембраны”, здольнага ўлаўліваць самыя розныя гукі, адбываецца выхад да праблемы памяці. З дапамогай каменя лірычны герой верша “Дзіўна, але ж ад яго...” (зб. “Крутаяр”) чуе крокі людзей на тым баку планеты. Раптам мірныя гукі заглушае лязгат казённых салдацкіх падкоў, злавесных гаўбічных шынаў. Чалавецтва нібыта скінула з рахунку крывавы вопыт апошняй сусветнай вайны, аднак лірычны герой не забыў нічога: “Я памяць збярог!” [6: 13]. Яго памяць ператварылася ў шэры камень – стала вечнай. У творы разбураецца замацаваны стэрэатып: “каменны” – значыць “чэрствы”, “нежывы”. Менавіта “каменная” глеба – глеба вечнай памяці – здольная ўзрасціць зярняты новага жыцця, павінна захаваць мір для наступных пакаленняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асабіста перажытае В.Зуёнкам, яго сям’ёй, усім беларускім народам у гады вайны ўвасобілася і ў адным з найбольш значных ліра-эпічных твораў В.Зуёнка – “Маўчанне травы” (1974 – 78), што можна адначасова лічыць паэмай *перасцеражэння* і паэмай *памяці*. Падзейную аснову твора складае суаднесены з трагічнымі перыядамі гісторыі жыццёвы шлях простага селяніна Васіля, прататыпам якога паслужыў бацька паэта. “Маўчанне травы” мае падзагаловак “Паэма лёсу”: “За кожным канкрэтным чалавекам, – тлумачыць сам В.Зуёнак такое вызначэнне, – стаіць лёс яго народа. Гэтыя іпастасі і катэгорыі неразлучныя, падзяляць іх нельга. І вось тут, якраз у гэтай паэме, мой дзіцячы лёс, убачаны з вышыні сённяшняга часу, з вышыні перажытага пасля. Тыя падзеі, якія ляглі ў аснову гэтага твора, і тое, што бачылася мне ў маленстве, узбагачаецца маім наступным жыццёвым вопытам. У паэме ўсё гэта знітавана” [7: 3].

Першасна-пачуццёвае дзіцячае ўспрыманне і аналітычна-ацэначны погляд дарослага паядноўваюцца ў вобразе лірычнага героя. Аўтар выкарыстоўвае прынцып двайнога бачання, уласцівы многім творам пісьменнікаў-шасцідзесятнікаў на ваенную тэму. У паэме побач з лірычным героем, дарослым чалавекам, прысутнічае хлопчык Васіль, максімальна збліжаны з эмпірычнай асобай паэта. Аўтар, ці лірычны герой, не проста складае летапіс падзей, сведкам якіх быў у дзяцінстве, а перажывае ўсё наноў, перадумвае, прапускае праз сэрца. Лірычны герой адначасова належыць да дзвюх эпох: узнаўляючы мінулае, ён глядзіць назад, праз гады, вачамі сучаснасці.

Гуманістычная канцэпцыя паэмы засноўваецца на сцвярджэнні выпрабаванай часам “праўды зерня”– стваральнай сілы духоўна багатага народа, – носьбітам якой у творы выступае перш за ўсё Васіль. Яму, мірнаму працаўніку, цяжка зразумець страшны сэнс вайны: “І той, хто народжаны сеяць і жаць / Ды плугам аблогу дзерці, / Крывавую ношу павінен узяць: / Забіваць у імя бяссмерця…” [8: 276]. Чулая Васілёва душа не можа апраўдаць нават такую кроў. Герою В.Зуёнка, як і ўсяму беларускаму сялянству, блізкія пацыфісцкія погляды на быццё, і ўсё ж ён вымушаны ўрэшце прызнаць, “што не ў жыце / Вырастае праўда ў гэткі час” [8: 248], – “праўда зерня” часова (!) саступае месца “праўдзе барацьбы”. Васіль гэта разумее, але доўгі час не прымае душой (“Навошта ж і неба і гэта зямля, / Як вечна такое будзе?..” [8: 276]), і толькі смерцю ён паяднае дзве праўды.

У час ваеннага ліхалецця Васіль не застаецца ў баку ад падзей: па заданні падпольшчыкаў становіцца старастам, што прыносіць яму

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нямала пакут. Некалькі разоў яму даводзіцца блізка ўбачыць смерць (нават капаць самому сабе магілу). Аднак, напэўна, ці не самым цяжкім выпрабаваннем стала для яго сустрэча з “жалезнай птушкай” – фашысцкім самалётам, – якая ледзь не абярнулася трагедыяй: смерць пагражала Васілёваму сыну, надзеі і працягу бацькі. Маленькі хлопчык паказваецца на мяжы сутыкнення дзвюх стыхій – зямлі і неба: “Бог свінцовы, а насупраць – жытні: / Палявік, сявец, каласавік. / Там – двухствольны, на зямлі – двухжыльны, – / Хто каго – па роўнядзі разлік. / Неба і зямля. І паміж імі – / Распластаны коціцца хлапчук. / Неба і зямля. І межавымі – / Два слупы: два выбухі ўваччу…” [8: 239–240]. У крытычнай сітуацыі (паміж Жыццём і Смерцю) неба бачыцца аўтару варожай стыхіяй, неверагоднай нівай, адкуль “бомбы прарастаюць да зямлі”. Змаганне Жыцця і Смерці выяўляецца праз супрацьстаянне зерня і бомбаў, мяккай раллі і “нябеснай, непадступнай цвердзі”, дзвюх “рам” – “букварнай, што «мыла мама»”, і самалёта-“рамы” “з азбукаю смерці пад крылом”, жытняга і свінцовага багоў. Менавіта на сутыкненні гэтых анталагічных катэгорый – зерне, жыццё і хаос, смерць – і ствараецца, па словах У.Калесніка, “медытатыўны пафас паэмы, яе філасофска-роздумны пачатак” [9: 153].

Значная ўвага ў паэме “Маўчанне травы” надаецца праблеме нясконачанай вайны – і асабліва ў раздзеле “Мезены палец (Балада няспаленай вёскі)”, што не мае цеснай сувязі з сюжэтам і можа ўспрымацца як самастойнае мастацкае цэлае. Кампазіцыйна раздзел складаецца з дзвюх частак: лірычнай і эпічнай. Лірычная плынь нібы апаясвае змест твора, падпарадкоўвае сабе яго зачын і фінал – аўтарскі роздум аб вайне. Памяць пра тры такія доўгія (“як тры тысячагоддзі”) ваенныя гады на Беларусі і праз шмат часу не адпускае тых, хто перажыў фашысцкую навалу: “Тры гады – праз трыццаць – б’юць навылет, / Тры гады крыві, адчаю, адчаю. / Тры гады – пад сэрцам вы застылі / І праз трыццаць будзіце начамі” [8: 280]. Аўтар просіць прабачэння ў спаленых вёсак, адчувае сябе “вечна вінаватым” перад імі за тое, што яго роднае Узбор’е ўцалела, не паўтарыла лёс Хатыняў. Аднак вайна не абмінула вёску, спапяліла сэрцы яе жыхароў.

Эпічная частка, “Балада пальца”, канцэптуальна блізкая да верша “З вайны сустрэлі мацеркі сыноў...” і працягвае тэму асірацелых матуль. В.Зуёнак распавядае пра “мезены пальчык” – самага малодшага сына сваёй землячкі, “курсанта праднавальнічнага саракавога”. Усю вайну чакала цётка Ева сына, але весткі пра яго дачакалася толькі праз дваццаць год: згорнутая ў гільзу паперка, знойдзеная ў падмаскоўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зямля, захавала прозвішча і адрас забітага лейтэнанта. Аўтар схіляецца перад Мужнасцю і Любоўю Маці, якія ў чаканні сыноў доўгія гады пакідаюць незашчэпленымі дзверы, псіхалагічна тонка, асцярожна і разам з тым непрыхавана-праўдзіва перадае “мацярок нявысненае гора”.

У хату кожную беларускую сям’ю, у кожнае сэрца вайна прынесла сваё гора, сваю Хатынь. Не даць забыцца пра гэта, не дазволіць паўтарыцца страшнай трагедыі імкнецца В.Зуёнак. Сваімі творамі-набатамі, творамі-засцеражэннямі ён будзіць людскую памяць – маральны імператыў паэта “Не забудзь!” гучыць ва унісон з біблейскімі запаветамі.

Літаратура

1. Зуёнак В. “Наканаванне паэта – жыць на разломе”: [Гутарка Я.Конева з В.Зуёнкам] // Беларуская думка.– 1993.– № 4.– С. 81–84.
2. Зуёнак В. Чорная лесвіца: Вершы і паэма.– Мінск: Маст. літ., 1992.– 159 с.
3. Сіпакоў Я. Выбраныя творы: У 2 т.– Мінск: Маст. літ., 1995–1997.– Т. 1: Паэзія.– 1995.– 431 с.
4. Зуёнак В. Зорнае зерне: Вершы // Літ. і мастацтва.– 2001.– 22 чэрв.– С. 8.
5. Вярцінскі А. Я памяць збярог… // Полымя.– 1970.– № 2.– С. 218–220.
6. Зуёнак В. Крутаяр: Вершы.– Мінск: Беларусь, 1969.– 72 с.
7. Зуёнак В., Шамякін І. Фрунзе, 5: [Гутарка А.Рыгоравай з В.Зуёнкам і І.Шамякіным] // Культура.– 1995.– 17–23 мая.– С. 2–3, 9.
8. Зуёнак В. Выбраныя творы: У 2 т.– Мінск: Маст. літ., 1996–1998.– Т. 2: Пяцірэчча: Кніга паэм.– 1998.– 319 с.
9. Колесник В. Эстафета судьбы // Нёман.– 1982.– № 1.– С. 152–155.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ